# Дзень універсітэта

Змястоўнай была праграма святкавання Дня ўніверсітэта-2019, які адбыўся ў ПДУ на гэтым тыдні.

У ліку ўрачыстасцяў — пасяджэнне Савета ўніверсітэта з уручэннем спецыяльнага нагруднага знака «За заслугі перад Полацкім дзяржаўным універсітэтам» і іншых узнагарод, а таксама цырымонія ўручэння спецыяльнай прэміі «Крыніца ведаў». Разнастайныя акцыі, флэшмоб, велапрабег, лёгкаатлетычная эстафета, дыскатэка для моладзі надалі асаблівы драйв студэнцкім будням. А сёння адбудзецца турыстычны фэст маладых вучоных.

**Аксана ШУЙСКАЯ.**